Партызанская разведка, народжаная агульнанароднай барацьбой з захопнікамі і патрыятызмам, здолела паспяхова выканаць пастаўленыя перад ёй задачы па забеспячэнню савецкіх войск патрэбнай інфармацыяй.

[1] 1941 год: трагическое и героическое: Тез. межреспубл. науч. конф. Мн., 1991. С. 138.

[2] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 3500, воп. 12, спр. 10, арк. 18.

[3] Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны 1941—1944 гг. Мн., 1983. С. 20—21.

[4] НАРБ. Ф. 4, воп. 29, спр. 27, арк. 94, 96; воп. 2, спр. 62, арк. 561—562; ф. 3500, воп. 3, спр. 279, арк. 55; спр. 115, арк. 176.

[5] Там жа. Ф. 3500, воп. 3, спр. 148, арк. 3, 4, 5, 11, 13; спр. 87, арк. 34—36, 41, 75; ф. 4, воп. 33а, спр. 532, арк. 1—10; спр. 601, арк. 78.

[6] Там жа. Воп. 3, спр. 138, арк. 16; Коммунист Белоруссии. 1977. № 7. С. 39.

[7] НАРБ. Мікраплёнка. Інв. № 011, кадр. 18.

[8] Белоруссия в Великой Отечественной войне 1941—1945. Мн., 1990. С. 456; НАРБ. Ф. 4, воп. 33а, спр. 425, арк. 141; ф. 3500, воп. 2, спр. 105, арк. 4, 7-7 об.

[9] НАРБ. Ф. 4, воп. 33а, спр. 425, арк. 113, 260; ф. 3500, воп. 2, спр. 927, арк. 11—17.

[10] Там жа. Ф. 3500, воп. 3, спр. 104, арк. 91; воп. 23, спр. 21, арк. 116; Долготович Б. Д. В едином строю — к единой цели. Мн., 1985. С. 127—128.

[11] НАРБ. Ф. 3500, воп. 3, спр. 67, л. 47; спр. 104, арк. 104; спр. 132, арк. 66.

[12] Там жа. Спр. 67, арк. 43—49; спр. 104, арк. 102—104; спр. 132, арк. 67; Долготович Б. Д. Указ. раб. С. 126.

Н. А. КУТУЗАВА

## З ГІСТОРЫІ ФАРМІРАВАННЯ ПАРТЫЙНАЙ СІСТЭМЫ Ў РАСІІ (1917—1918)

Шматпартыйнасць, што з'яўляецца характэрнай рысай сучаснай палітычнай прасторы, з нядаўняга часу стала рэальнасцю і для нашага грамадства. Яна прымушае сучасных вучоных і палітыкаў рашаць мноства палітычных галаваломак, агульную задачу якіх можна сфармуляваць як пошук аптымальнай мадэлі функцыяніравання грамадства, складанне дзейснай партыйнай сістэмы, адпаведнай умовам соцыуму. Партыйная сістэма, на маю думку, гэта ўзгодненая і адпаведная прававым нормам сукупнасць палітычных партый, якія з'яўляюцца дзейснымі суб'ектамі ўлады. Пачатак фарміравання партыйнай сістэмы ў Расіі можна аднесці да сакавіка 1917 г., калі ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі палітычныя партыі сталі носьбітамі ўлады і ўзялі на сябе ролю арганізатараў новага палітычнага ладу ў краіне.

Першасным пытаннем пры фарміраванні кожнай партыйнай сістэмы з'яўляецца пытанне аб форме і сутнасці той прадстаўнічай сістэмы і адпаведных ёй палітычных інстытутаў, дзе яна будзе функцыяніраваць. У Расіі, якая прайшла праз Лютаўскую рэвалюцыю і разбурэнне традыцыйных інтытутаў самаўладдзя, працэс фарміравання эфектыўнай партыйнай сістэмы стаў у залежнасць ад здольнасці палітычных партый выпрацаваць канструктыўную праграмму рэформ у краіне. У гэтай сувязі асаблівы інтарэс прадстаўляе інстытуцыянальны аспект развіцця партыйнай сістэмы, стварэнне цэнтральных органаў улады і партыйнае прадстаўніцтва ў іх.

Лютаўская рэвалюцыя прывяла да ўлады Часовы ўрад, склад якога да кастрычніка 1917 г. некалькі разоў змяняўся. Найбольш доўгі тэрмін (02.03—05.05.1917) існаваў урад, які быў сфарміраваны на перагаворах прадстаўнікоў Выканкама Петраградскага Савета і Часовага Камітэта Думы і зацверджаны галасамі шасцісот эсэраў і меншавікоў, членаў Петраградскага Савета. Партыйны склад урада быў фактычна аднолькавым са складам Часовага Камітэта Думы, дзе пераважалі кадэты і акцябрысты[1].

Уладарная база трымалася на існаванні двух блокаў: ліберальнага і кансерватыўнага, але Часовы ўрад функцыяніраваў як аднародны, забяспечыўшы гэтым неабходнае адзінства ўлады.

Цікава, што Партыя Народнай Свабоды (кадэты), якая ў сакавіку 1917 г. развівала ідэю адзінства ўлады, унесла ў сваю праграму мадэль парламенцкай прэзідэнцкай рэспублікі: прэзідэнт павінен выбірацца на вызначаны тэрмін парламентам і ажыццяўляць кіраванне выканаўчай уладай пры дапамозе «адказ-

нага перад народным прадстаўніцтвам міністэрства»[2]. З пункту гледжання кадэтаў, палітычная аднароднасць урада і ўлады ўвогуле павінны быць звязаны або з дамінаваннем адной партыі, якая з'явілася б выразнікам агульных нацыянальных інтарэсаў (менавіта такой лічылі кадэты сваю партыю), або блока партый (у дадзеным выпадку — ліберальна-кансерватыўнага), які будаваўся б на аснове партыйнага пагаднення па найважнейшых палітычных пытаннях.

Спроба рэалізацыі гэтай мадэлі і была зроблена на працягу сакавіка—красавіка 1917 г. Аднак для яе нармальнага функцыяніравання і далейшага развіцця ў Расіі адсутнічалі два неабходныя элементы: шырокая сацыяльная база для дзейнасці ўрадавых партый і безумоўная падтрымка з боку патэнцыяльных апанентаў.

Першыя прыметы наспелага крызісу з'явіліся ў сакавіку 1917 г., калі па распараджэнню міністра-старшыні Г. Е. Львова ліквідавалася традыцыйная адміністратыўная сістэма краіны. Львоў лічыў, што гэтая мера актывізуе рэвалюцыйную творчасць народа[3]. Але народ задаволіўся ўстанаўленнем на месцах улады Саветаў замест улады цэнтральнага ўрада і такім чынам прадэманстраваў сваё неразуменне ліберальных палітычных каштоўнасцей.

Нота Мілюкова ад 18 красавіка аб неабходнасці выканання ваенных абавязкаў перад саюзнікамі з'явілася прычынай урадавага крызісу: Савет адмовіўся падтрымаць урад і ўпершыню апынуўся ў ролі яго апазіцыі. Падзеі красавіка 1917 г. выявілі непрыняцце палітыкі ўрада масамі і паставілі пытанне аб несумяшчальнасці партыйнай аднароднасці і легітымнасці ўрада. Зняць гэтую супярэчнасць члены Часовага ўрада спрабавалі шляхам кампрамісу з умеранымі сацыялістамі. Так, на нарадзе ўрада з Выканкамам Савета 21 красавіка з'явілася альтэрнатыва лозунгу «Уся ўлада — Саветам!» у выглядзе кааліцыйнага ўрада. Унутраныя супярэчнасці, якія ўзмацніліся ў гэты перыяд, падарвалі давер насельніцтва як да кожнай партыі, так і да партыйных блокаў.

Гісторыя трох шматпартыйных кааліцыйных урадаў гэтага перыяду прадстаўляе асаблівую цікавасць для даследчыкаў. Партыйны склад першай і другой кааліцый адрозніваўся мала ў чым[4]. Калі ў склад першай кааліцыі (06.05—02.07.1917) уваходзілі чатыры кадэты, па два прадстаўніка эсэраў, меншавікоў і акцябрыстаў, па аднаму прадстаўніку трудавікоў і народных сацыялістаў, то склад другой кааліцыі (25.07—26.08.1917) папоўніўся прадстаўнікамі эсэраў і трудавікоў (па аднаму), упершыню сюды ўвайшлі прагрэсісты і рэспубліканскія дэмакраты, але страцілі сваіх прадстаўнікоў акцябрысты і народныя сацыялісты. Лідэры галоўных сацыялістычных партый не ўвайшлі ва ўрад першага саставу (міністры-сацыялісты: Цэрэтэлі, Скобелеў, Пяшахонаў, Чарноў, Керанскі, Пераверзяў прадстаўлялі ўмеранае крыло сваіх партый). Першая кааліцыя была адзначана як палітычная фікцыя, удзел ў ёй сацыялістаў насіў, па сутнасці, дэкларатыўны характар[5]. Пераважная большасць месц ва ўрадзе належыла буржуазным партыям. Першая ліберальна-сацыялістычная кааліцыя на кароткі час садзейнічала змякчэнню крызісу ўлады. Аднак кампраміс хаваў шмат канфліктаў, якія былі абвостраны рэзалюцыямі 1-га Усерасійскага з'езда Саветаў, што замацоўвалі адказнасць міністраў-сацыялістаў перад Саветам. З'езд таксама пастанавіў скласці адзіны паўнамочны прадстаўнічы орган усёй арганізаванай дэмакратыі[6].

Нягледзячы на тое, што ідэю кааліцыі падтрымлівалі як сацыялісты, так і лібералы, шматпартыйная сістэма ў такім варыянце не мела ніякіх перспектыў. З самага пачатку яна несла на сябе пячаць нестабільнасці. Усё тая ж адсутнасць сацыяльнай базы партый, членаў кааліцыі, вызначыла яе лёс. Нестабільнасць таксама ўзмацнялася партыяй, якая знаходзілася за мяжой вядомай партыйнай сістэмы і адрознівалася ад іншых жорсткай арганізацыйнай дысцыплінай і фактычна кантралявала паводзіны «вуліцы» — гэта партыя бальшавікоў. Яна ўяўляла сабой небяспечную сілу, здольную аказваць ціск на ўрад і партыйную сістэму. З красавіка 1917 г., калі партыя бальшавікоў актывізавала сваю прапагандысцкую дзейнасць, а кааліцыйныя партыі адмовілі ёй у супрацоўніцтве, шансы на стабільнасць страціліся.

Новы (ліпеньскі) крызіс ярка выявіў хісткасць шматпартыйнай сістэмы і ўрадавай кааліцыі. Апроч таго, да анціўрадавай палітыкі бальшавікоў далучылася крытыка ўрада з боку Часовага камітэта Дзяржаўнай Думы. На пасяджэнні 18 ліпеня правае крыло камітэта (Пурышкевіч, Масленнікаў) паставіла пытанне аб легітымнасці ўрада і патрабавала аднаўлення сапраўднага прадстаўнічага органа — Думы, справаздачы ўрада перад ім і недапушчэння ўлады Саветаў[7]. З гэтага часу кааліцыя, ужо пазбаўленая ўлады, яшчэ прадаўжае сваё існаванне, але няўхільна набліжаецца да тупіка.

Наяўнасць моцнай апазіцыі, падзеленай на два супярэчлівых лагера — кансерватыўны і радыкальна-сацыялістычны, — прывяла да таго, што склад новай, другой кааліцыі, ужо не залежыў ад партыйнасці. На нарадзе пяці партый, Думскага камітэта і выканкамаў Саветаў, якая адбылася ў ліпені 1917 г., Керанскаму была дадзена поўная свабода для фарміравання новага кабінета. Міністры цяпер не з'яўляліся прадстаўнікамі партый і не неслі адказнасці перад Саветамі. Уся дзейнасць другой кааліцыі звялася да арганізацыі рэпрэсій супраць бальшавікоў: ад адпраўкі воінскіх часцей, якія падтрымлівалі бальшавікоў, на фронт да арышту іх лідэраў. Рэпрэсіўныя меры і бяздоказнае прыпісванне адказнасці за арганізацыю ліпеньскіх беспарадкаў стварылі бальшавікам арэол мучанікаў. У выніку, недавер да ўрада ўзмацніўся, а працэс палявення мас паскорыўся. Бальшавізацыя Саветаў ішла знізу, на раённым узроўні, калі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт яшчэ заяўляў аб сваёй падтрымцы Часовага ўрада. Разыходжанне палітычных пазіцый раённых саветаў і іх цэнтральных органаў выявілася ў ліпені — жніўні на Міжраённай нарадзе Саветаў, дзе актыўна выступілі левыя сацыялістычныя групы[8].

Далейшая дынаміка падзей адлюстроўвае палярызацыю палітычных сіл і адыход ад ідэі шматпартыйнай кааліцыі на карысць моцнай надкласавай і надпартыйнай улады. Гэта думка была выказана ўпершыню ў жніўні 1917 г. на Дзяржаўнай нарадзе і тлумачылася неабходнасцю моцнай дыктатуры, здольнай устараніць распыленасць палітычнай улады, утаймаваць рэвалюцыю і прадухіліць рух нямецкіх войск у глыб Расіі[9]. Пытання аб стварэнні парламенцкай прэзідэнцкай рэспублікі цяпер не падымаюць нават яго аўтары і гарачыя прыхільнікі — кадэты. У жніўні адбылося збліжэнне ваенных вярхоў з лідэрамі кадэтаў: імі разглядалася магчымасць устанаўлення ваеннай дыктатуры. У перыяд жнівеньскага крызісу кадэты настойвалі на звальненні Керанскага і перадачы ўладарных паўнамоцтваў генералу Аляксееву. Мяцеж Карнілава з'явіўся апагеем працэсу кансалідацыі правых і адначасова — падставай для згуртавання левых сіл. І мяцеж, і арганізацыя адпору яму прайшлі пад лозунгамі ратавання Айчыны. Аднак у працэсе падаўлення мяцяжу чаша палітычных шаляў нястрымна схілялася ў бок партыі бальшавікоў — галоўнага арганізатара яго разгрому.

Такім чынам, партыя бальшавікоў стала адзінай апазіцыйнай сілай, небяспечнай для ўрада. Выбары ў гарадскія думы Масквы і Петраграда, якія прайшлі ў жніўні, далі значнае павелічэнне галасоў, пададзеных за бальшавікоў: адпаведна — 52 і 33 %; у той жа час гэтыя паказчыкі ў эсэраў і меншавікоў зменшыліся[10].

У супрацьстаянні дзвюх палітычных сіл (ліберальна-кансерватыўнага блока, які быў падтрыманы вайскоўцамі, і бальшавікоў), што прэтэндавалі з рознымі шансамі на ролю адзінага выразніка агульных нацыянальных інтарэсаў, магла з'явіцца толькі мадэль аўтарытарнай партыйнай сістэмы.

Партыі меншавікоў і эсэраў, якія не ўпісваліся ў гэты палітычны расклад, пасля доўгіх хістанняў выбралі шлях рэанімацыі кааліцыі. У склад апошняга (трэцяга) кааліцыйнага ўрада (25.09—25.10.1917) увайшлі чатыры кадэты, астатнія пасады занялі сацыялісты. П. М. Мілюкоў назваў гэты склад «ненатуральным прадстаўніцтвам партый»[11]. Кааліцыя была ліквідавана Кастрычнікам 1917 г., які прынёс новы расклад палітычных сіл. Урадавыя і апазіцыйныя партыі мяняюцца месцамі, што наглядна адлюстраваў партыйны склад Другога з'езда Саветаў, дзе бальшавікі мелі сапраўды пераважную большасць. Згодна папярэдняму апытанню 505 з 670 дэлегатаў выказаліся за склад урада, адпаведны партыйнаму складу з'езда. У такім выпадку бальшавікі атрымлівалі дамінуючую ролю ва ўрадзе і безумоўнае лідэрства ў партыйнай сістэме наогул[12].

Часовы Рэвалюцыйны ўрад (СНК), створаны Другім з'ездам Саветаў, першапачаткова складаўся з бальшавікоў. Умераныя сацыялісты праз Вікжэль патрабавалі, каб ні адна з партый не мела ва ўрадзе большасці і каб міністры дзейнічалі ва ўрадзе не ў якасці партыйных прадстаўнікоў, а як незалежныя асобы. Урад павінен быць падсправаздачным не ЦВК, а прадстаўнічаму органу больш шырокага складу[13]. ЦВК, выбраны на Другім з'ездзе Саветаў, таксама складаўся пераважна з бальшавікоў.

За стварэнне ўрада з удзелам усіх сацыялістычных партый выступілі Каменеў і Зіноўеў. Нягледзячы на ультыматыўнае патрабаванне ЦК партыі бальшавікоў аб захоўванні партыйнай дысцыпліны, з урада выйшлі бальшавікі, якія падтрымалі гэтую ідэю. Іх месцы занялі левыя эсэры, якія знаходзіліся ў складзе ўрада да сакавіка 1918 г.

Грунтоўнай праблемай новага ўрада стала забеспячэнне яго легітымнасці. На выбарах ва Устаноўчы сход бальшавікі атрымалі толькі 175 месц з 707,

г. зн. менш за чвэрць. Пераважную большасць галасоў тут атрымала партыя эсэраў — 410[14]. Партыйны склад Устаноўчага схода зноў актуалізаваў пытанне аб урадавай кааліцыі. Аднак уваходжанне ва ўрад левых эсэраў стварыла яе ілюзію і дапамагло зняць палітычнае напружанне ў партыйных колах. Замацаваць сваё дамінаванне ва ўрадзе бальшавіцкай партыі ўдалося ў канцы лістапада 1917 г.

Палітычная апазіцыя новаму рэжыму, якая склалася ў выніку выбараў ва Устаноўчы сход у асобах кадэтаў, правых эсэраў і вайсковых вярхоў, паспрабавала склікаць Устаноўчы сход 28 лістапада. Пасля таго, як савецкія ўлады забаранілі гэту спробу, пачалася канцэнтрацыя апазіцыйных сіл на поўдні краіны. Гэтыя падзеі з'явіліся падставай для арганізацыі рэпрэсій супраць антысавецкіх сіл і адмаўлення ад ідэі Устаноўчага сходу як заканадаўчага органа. Легітымацыя новага ўрада адбылася на спецыяльна скліканым III Усерасійскім з'ездзе Саветаў.

У перыяд з кастрычніка 1917 па ліпень 1918 г. партыйная сістэма ў Расіі развівалася па мадэлі дамінуючай партыі бальшавікоў, якая дзяліла сваю ўладу з вельмі малалікім прадстаўніцтвам партыі левых эсэраў. Але пасля мяцяжу ў ліпені 1918 г. левыя эсэры былі аб'яўлены па-за законам. Пяты Усерасійскі з'езд Саветаў у ліпені 1918 г. прыняў Канстытуцыю РСФСР, якая замацавала блытаніну ў паўнамоцтвах органаў улады (з'езда Саветаў, УЦВК і Саўнаркома РСФСР) і стала адным з фактараў усталявання неабмежаванай улады адной партыі.

Складанасць гістарычнай сітуацыі (эканамічная разруха, наступленне нямецкіх войск, грамадзянская вайна) зрабіла цэнтралізацыю кіравання грамадствам надзённай палітычнай задачай, пытаннем выжывання дзяржавы. Аднак пры гэтым не трэба недаацэньваць фактар моцнага ўплыву прынцыпаў унутранай арганізацыі кіруючай партыі на грамадзянскія адносіны. З кастрычніка 1917 г. назіраецца працэс прыстасавання структуры партыі да грамадскіх патрэб: ствараецца шматфункцыянальная сетка розных органаў — савецкіх, гаспадарчых і інш. Новая сістэма кіравання будуецца на прынцыпах унутранага партыйнага жыцця. Па меры зліцця партыі з дзяржаўнымі і грамадскімі інстытутамі, распаўсюджвання ідэалогіі партыі на ўсе грамадскія адносіны адбываецца трансфармацыя дамінуючай партыі ў партыю таталітарную.

Фарміраванне партыйнай сістэмы ў Расіі за кароткі перыяд прайшло некалькі этапаў: гэта нестабільная шматпартыйная сістэма, прадстаўленая ўрадавай кааліцыяй лібералаў і дэмакратаў, і аднапартыйная сістэма ў дзвюх мадыфікацыях: дамінуючай партыі (або партыйнага блока) і партыі таталітарнай. Трэба адзначыць, што ў Расіі механізм партыйнага прадстаўніцтва ва ўладарных структурах знаходзіўся толькі ў працэсе станаўлення — аб гэтым сведчыць, у прыватнасці, прынцып фарміравання ўрада па асобасных якасцях. Гэты факт наклаў свой адбітак на развіццё партыйнай сістэмы, надаў ёй суб'ектыўны, ненатуральны характар. Аднак вынік развіцця кожнай з мадэлей партыйнай сістэмы дае наглядны ўрок для сучасных палітыкаў. Тым больш, што сённяшняя палітычная сітуацыя актуалізуе праблему выбару курсу, які адказвае інтарэсам нацыянальнай кансалідацыі і дэмакратызацыі грамадства.

[1] Гл.: Спирин Л. М. Россия. 1917. М., 1987. С. 72.
[2] Программы главнейших русских партий. М., 1917. С. 41.
[3] Милюков П. Н. Воспоминания. М., 1991. С. 228.
[4] Спирин Л. М., Россия. С. 123, 192.
[5] Милюков П. Н. Воспоминания. С. 320.
[6] Первый Всероссийский съезд Советов в документах и материалах. М.; Л., 1930. Т. 1. С. 23 і наст.
[7] Рабинович А. Большевики приходят к власти. М., 1989. С. 70.
[8] Районные Советы Петрограда в 1917 году. М.; Л., 1964. Т. 3. С. 248 і наст.
[9] Государственное совещание: Стенограф. отчет. М., 1930. С. 49—50, 60—61.
[10] Спирин Л. М. Россия. С. 235.
[11] Милюков П. Н. Воспоминания... С. 279.
[12] Гл.: Второй Всероссийский съезд Советов: Сб. докум. М., 1957. С. 386 і наст.
[13] Гл.: Рабинович А. Большевики... С. 380.
[14] Гл.: Всероссийское Учредительное собрание. М.; Л., 1930. С. 115.